# Да 82-й гадавіны з дня нараджэння В. І. Леніна

Працоўныя беларускай сталіцы рыхтуюцца шырока адзначыць 82-ю гадавіну з дня нараджэння Владзіміра Ільіча Леніна. На прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах Мінска праходзяць гутаркі і лекцыі аб жыцці і дзейнасці вялікага стваральніка большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы.

У Дзяржаўнай бібліятэцы, якая носіць імя геніяльнага правадыра, арганізавана да знамянальнай даты вялікая выстаўка літаратуры. У цэнтры выстаўкі — фотаплакат, які адлюстроўвае рэволюцыйную дзейнасць Владзіміра Ільіча. Над плакатам словы таварыша І. В. Сталіна: «Ленін быў народжаны для рэволюцыі. Ен быў сапраўды геніем рэволюцыйных узрываў і найвялікшым майстрам рэволюцыйнага кіраўніцтва».

У першым аддзеле выстаўкі — поўны збор Твораў В. І. Леніна. Другі аддзел займаюць працы таварыша І. В. Сталіна аб Леніне, артыкулы кіраўнікоў партыі і ўрада, прысвечаныя Владзіміру Ільічу. Трэці аддзел апавядае аб дружбе вялікіх правадыроў рэволюцыі — Леніна і Сталіна. У аддзеле «Вобраз Леніна ў мастацкай літаратуры» выстаўлены зборнікі народнай творчасці і кнігі совецкіх пісьменнікаў, прысвечаныя Ільічу. Сярод іх — кнігі Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова.

Наведвальнікі бібліятэкі з вялікай цікавасцю праглядаюць гэтую выстаўку.

Выстаўка літаратуры да 82-й гадавіны з дня нараджэння Владзіміра Ільіча арганізавана таксама ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. 22 красавіка тут адбудзецца канферэнцыя чытачоў, прысвечаная жыццю і дзейнасці вялікага правадыра.